*Прачытаў — перадай суседу!*

# СЕРАБРАНКА вольная

МЯСЦОВАЯ ГАЗЕТА НЕЗАЛЕЖНАГА ГРАМАДСТВА

№ 7 (11) лістапад 2008

Як пражыць на малую пенсію *(старонка 3)*

Ці варта будаваць АЭС у Беларусі? *(старонкі 4-5)*

Чыноўнікі "вылечылі" інваліда *(старонкі 6-7)*

Прадпрымальнікі выходзяць на марш *(старонка 8)*

# Подых крызісу




Нягледзячы на тое, што, паводле слоў кіраўніка краіны, крызісу ў нас няма, жыхары Серабранкі, значная частка якіх працуе на МАЗе, МТЗ, ММВЗ, пачынаюць атрымліваць трывожныя сігналы з родных прадпрыемстваў.

Як паведамілі нашаму выданню кампетэнтныя крыніцы з Мінскага аўтамабільнага заводу, адбываецца істотнае скарачэнне вытворчасці, бо рэзка абвастрылася праблема са збытам прадукцыі. З-за сусветнага эканамічнага крызісу традыцыйныя пакупнікі на Усходзе адмаўляюцца ад сваіх замоў па прычыне сваёй неплацежаздольнасці. Па нашай інфармацыі, у лістападзе вытворчыя планы па заводскіх цэхах былі зніжаны на 30% у адносінах да папярэдняга месяца. У снежні скарачэнне складзе 40%. Пра планавае падвышэнне заробкаў няма і гутаркі. Работнікі прадпрыемства непакояцца, каб з новага году не пачалося скарачэнне працоўнага тыдня і зніжэнне заробкаў. Рэдакцыі "ВС" паведамілі, што супрацоўнікаў гіганта аўтабудавання папярэдзілі, каб яны не бралі крэдыты ў банках. У будучым у рабочых МАЗа цалкам верагоднае ўзнікненне праблемаў з іх аплатай з-за зніжэння заробкаў.

Не лепшая сітуацыя на Мінскім трактарным заводзе. Усе завулкі і алеі на тэрыторыі завода забіты трактарамі. У лепшы час штомесяц выпускалася 6 тыс. машын і 2 тыс. трактаракамплектаў. Зараз амаль удвая меней. Няма збыту. Са снежня адміністрацыя завода прыняла рашэнне цалкам адмовіцца ад трэцяй змены для тых, чый заробак залежыць ад колькасці выпушчанай прадукцыі (ліцейшчыкі, маляры, гальваншчыкі, зборшчыкі машын). Сярод супрацоўнікаў заводу ходзяць чуткі пра тое, што ў бліжэйшыя дні абвесцяць пра двухтыднёвыя калядныя канікулы. Адмянілі рабочыя суботы (раней у гэты дзень рабілі ў тры змены). Як паведамілі рэдакцыі "ВС", адміністрацыя заводу звярталася ў Мінфін з просьбай скараціць працоўны тыдзень да 4-х дзён, аднак пакуль не атрымала згоду ўрадоўцаў.

**На тэрыторыі МТЗ вольныя пляцоўкі шчыльна застаўляюць навюткімі трактарамі**

У сувязі з жорсткай эканоміяй сродкаў, на МТЗ цалкам спыніліся закупы новага абсталявання. Прадпрыемства адмовілася ад прыёму на работу новых людзей, у тым ліку маладых спецыялістаў. Без ваганняў развітваюцца з пенсіянерамі, адмаўляючы працягваць кантракт, а таксама адразу звальняюць парушальнікаў дысцыпліны.

На электратэхнічным Заводзе імя Казлова рабочыя таксама рыхтуюцца да доўгіх Калядаў. Адпачываць хутчэй за ўсё давядзецца два тыдні. Па нашай інфармацыі, з новага году супрацоўнікам масава прапанавана пісаць заяўкі на адпачынак за свой кошт на адзін дзень у кожны тыдзень. Фактычна чатырохдзённы працоўны тыдзень уводзіцца таксама на заводзе падшыпнікаў.

Беларускія гастарбайтары з-за паўсюднага згортвання будоўлі вяртаюцца на радзіму, што толькі абвастрыць праблему беспрацоўя.

Праблемы са збытам беларускай прадукцыі тлумачацца не толькі цяжкім фінансавым становішчам традыцыйных пакупнікоў, але і тым, што з-за абумоўленага сусветным крызісам зніжэння цэнаў у замежных вытворцаў, нашыя трактары, МАЗы, лядоўні становяцца неканкурэнтаздольнымі.

ЭКАНОМІКА

# Прывід крызісу

пачатак на с.1

Сітуацыя ўскладняецца нежаданнем урада дэвальваваць беларускі рубель, тады як валюты краін суседзяў прыкметна патаннелі. З-за гэтага наша прадукцыя ў тых жа грыўнах ці расійскіх рублях становіцца даражэйшай.

Цяжка сказаць, што будзе з сацыяльнымі праграмамі ўраду, але дакладна вядома, што разглядаецца магчымасць згортвання альбо прыпынення шэрагу амбіцыёзных інвестыцыйных праектаў (пра АЭС чытайце на с.4) з-за неабходнасці істотнага змяншэння дзяржвыдаткаў.

Рынкавыя эканомікі вельмі аператыўна рэагуюць зніжэннем коштаў на сыравіну, паліва, матэрыялы. Для камандна-адміністрацыйнай сістэмы, прыкметы якой мае айчынная эканоміка, такія змены могуць стацца фатальнымі, бо датацыі з боку Расіі імкліва скарачаюцца (ім самім бы выжыць), а канкурэнцыя ва ўмовах зніжэння спажывання рэзка ўзрастае і збівае кошты на прадукцыю ва ўсім свеце.

**Артур Лагодны**

ЗДАРЭННЕ

# Смерць у шахце ліфта



Трагедыя здарылася ўвечары 6 лістапада ў 9-м пад'ездзе дома № 132 па пр. Ракасоўскага. Пенсіянер 1947 г.н. Мікалай А. зваліўся ў шахту ліфта, які рамантавалі амаль месяц.

Паводле папярэдніх звестак, непасрэдных сведак здарэння няма. Побач з уваходам у агульны калідор ляжаў пачак пельменяў і ключы ад кватэры. Небараку знайшлі на дне шахты ліфта рабочыя. Суседзі загінулага кажуць, што той любіў выпіць. Але, магчыма, менавіта ён сваёй недарэчнай смерцю выратаваў каго іншага. Адразу пасля трагедыі ў пад'ездзе пачалі расклейваць папярэджанні пра небяспеку. У тэрміновым парадку на наступны дзень на 7-м, 8-м і 9-м паверхах у ліфтах замянілі старыя расхістаныя дзверы.

Следчы пракуратуры Ленінскага раёну Д. Хадатовіч паведаміў, што мужчына быў нецвярозы. Следства не выключае, што пенсіянеру маглі "дапамагчы" ўпасьці ў шахту.

"Так, ведаю, што ў нашым доме здарылася", – кажа сталы мужчына, што паліць на прыступках. На пытанне, ці робяцца ў ягоным пад'ездзе ў сувязі са здарэннем нейкія захады, адказвае, што ніякай актыўнасці не заўважаў.

Прадпрыемтсва "Белліфт" ад каментароў адмаўляецца. Пракуратура Ленінскага раёну працягвае праверку.

**Міхась Завадскі (фота аўтара)**



# Як засцерагчыся ад фінансавай плягі?

**Андрусь М., 33 гады, галоўны інжынер:**

– У мяне ляжыць на дэпазіце некалькі тысяч даляраў. У канцы снежня сканчаецца тэрмін, буду здымаць, але што з грашыма рабіць далей, яшчэ не наважыў…

**Юрый Е., 38 гадоў, беспрацоўны:**

– Усе свае грошы я пускаю ў справу – выдаю пазычкі пад заклад маёмасці. Майму ламбарду гатоўка заўжды патрэбная, на яе стабільны попыт.

**Юрась К., 40 гадоў, службовец:**

– Ніякага ашчадку не маю, бо ўвесь заробак выдаткоўваю на ўтрыманне сям'і, выплату крэдыта…

**Сяргей М., 38 гадоў, галоўны бухгалтар:**

– На нашай фірме крызіс ускосна адбіўся, бо сёй-той з нашых кліентаў згарнуў рэкламную кампанію. Мяне асабіста небяспека страты назапашаных грошай не хвалюе, бо я раней набраў крэдытаў і цяпер разлічваюся. Натуральна, у сённяшніх варунках у дачыненнях з банкамі лепей быць дэбіторам, чымся крэдыторам. Альбо, кажучы прасцейшай мовай, лепей крэдыт, чым дэпазіт.

Вашыя чытачы апошнім часам мабыць устурбаваныя надыходам фінансавага крызісу, які бязлітасна шматае краіну за краінай, кантынент за кантынентам.

Да мяне звярталася плойма знаёмых па параду наконт укладаў у банках. Я ўсім ім шчыра раіў неадкладна забіраць свае грошыкі, бо пакідаць іх на дэпазітных рахунках надта рызыкоўна – уклады ж могуць замарозіць, прымусова памяняць на аблігацыі для будаўніцтва АЭС, здэвальваваць і да гэтага падобнае.

Калі ж хто мае крыху вольных грошай, то лепш іх укласці ў нейкую маёмасць – кватэру, самаход, пральную машыну, мэблю (у залежнасці ад сумы).

У нас з братам, дарэчы, дагэтуль ляжаць некранутымі ўклады ў Ашчадным банку. Некалі дзед паклаў нам па 1000 савецкіх рублёў, а цяперака яны ператварыліся ў … 90 (!) беларускіх рублёў. Гісторыя можа паўтарыцца, свае грошы паспеюць забраць першыя. Астатнія ж будуць на руінах фінансавай піраміды праводзіць устаноўчы сход Таварыства падманутых укладчыкаў. Але ўсё вышэйсказанае – мае прыватнае меркаванне, у таварыша Пракаповіча яно, ведама ж, інакшае.

**Апытанне жыхароў Серабранкі праводзіў Марцін Саўяк**

ЛЮДЗІ

# Як пражыць пенсіянеру

Алена Бурак

*Нядаўна ад свайго знаёмага пачула сумны жарт: "Пенсионеры Европы и Америки путешествуют по миру, а белорусские ходят помиру".*

Зразумела, што пенсіянеры жывуць па-рознаму. Мы не будзем аналізаваць матэрыяльнае становішча пенсіянераў сілавых структураў, былых чыноўнікаў: яны атрымліваюць прыстойную дапамогу. Звернем увагу на людзей, якія 40 гадоў адпрацавалі на заводах, у калгасах, школах, раённых паліклініках, гандлі… У лепшым выпадку іх пенсія 400-500 тысяч беларускіх рублёў, з якіх трэба заплаціць за кватэру, набыць лекі, прадукты, тое-сёе з прадметаў гігіены… А ёсць жа людзі, у якіх памер пенсіі не дасягае і 300 тысяч. Як жывецца ім? Дзе і як харчавацца, рабіць фрызуру, займацца фізкультурай, каб укласціся ў сціплую сумму?



АРТУР ЛАГОДНЫ

Старыя людзі гандлююць драбязой каля міні-рынка "Серабранка"

## Самае простае

Ёсць катэгорыя людзей, якая з раніцы запраўляецца танным пітвом. Гэта даволі высокакаларыйны прадукт. Таму тыя, хто сілкуюцца ім, часцяком могуць зэканоміць нават на шкварцы, а потым ачмурэлыя сядзяць альбо ляжаць каля пад'ездаў сваіх дамоў. На жаль, пладова-ягадныя ды іншыя падобныя напоі пры несумненным плюсе – даступным кошце – маюць адваротны бок – надзвычай нізкую якасць, якая драматычным чынам уплывае на здароўе спажыўца і яго сваякоў.

## "Шчасце" ў працы

Аднойчы на прыпынку ў гадзін 6 раніцы разгаварылася з чатырма кабетамі гадоў пад 70. Замест таго, каб заслужана адпачываць, яны ехалі на працу. Яны шчыра радаваліся такой магчымасці, бо ў іх ёсць лішняя капейчына, і яны могуць забяспечыць сабе нейкі прыстойны мінімум, пэўны ўзровень якасці свайго жыцця.

Шмат хто займаецца "звышдробным прадпрымальніцтвам". Зразумела, не ад сытага жыцця з 9 раніцы бабулькі з торбамі пустых бутэлек, назбіраных увечары, цягнуцца да пунктаў прыёму шклатары. І гэта нягледзячы на тое, што залогавы кошт посуду знізіўся амаль да кошту запалак (напрыклад, за паўлітровую бутэльку даюць каля 100 рублёў).

Некаторыя бабулькі вясковага паходжання ў спёку і холад цэлымі днямі сядзяць на прыпынках грамадскага транспарту і гандлююць смажанымі семкамі.

## Арэндадаўцы

Дзеля вырашэння сваіх матэрыяльных праблемаў некаторыя часцяком здаюць сваю кватэру, якую атрымалі альбо набылі яшчэ ў савецкія часы. Самі пры гэтым з'язджаюць на летні сезон на лецішча альбо ў вёску на 1-2 гады.

## Што? Дзе? Па чым?

Адзінокія пенсіянеры выжываюць паасобку. Тыя, хто не могуць працаваць, жывуць вельмі сціпла і не разлічваюць на дапамогу дзяцей, у якіх безліч сваіх праблемаў. Каб набыць танныя мясныя і малочныя прадукты, старыя жанчыны едуць у Дражню. На Камароўцы, калі пашанцуе трапіць на акцыю, можна набыць бутэльку алею за 4200, а не за 6 тысяч, як у краме. Многія выстойваюць чэргі за трохі заляжалай гароднінай, якая на серабранскім рынку прадаецца па зніжаных коштах, апранаюцца з "Сэканд-хэндзе" на Шэпічах, дзе можна набыць таннае і даволі някепскае адзенне.

Пажылыя людзі таксама хочуць жыць паўнавартасна. Акрамя ежы і адзення ім трэба наведваць тэатры, басейн, добра выглядаць. У цырульні на вул. Кальварыйская ("Дом міласэрнасці") заўсёды мноства старых з розных куткоў горада, бо там вельмі танна абслугоўваюць.

*Бясплатны манікюр зробяць на вул. Маякоўскага, а фрызуру за паўцаны на Кальварыйскай*

Нядаўна адна знаёмая пенсіянерка падзялілася сакрэтам бясплатнага манікюра. Яго робяць на вул. Маякоўскага, 24 (уваход з двара). Часта старыя людзі сустракаюць сваіх аднагодкаў у тэатры, калі ідзе апошні прагон спектакля перад прэм'ерай і яго можна паглядзець бясплатна. Серабранскія пенсіянеры едуць у басейн на вул. Сталетава, дзе кошты аднаразовых квіткоў 4 тысячы, а не 6400, як у ФАК "Серабранка". Ва Уруччы можна прайсці курс бясплатнага масажу на паўднёвакарэйскім абсталяванні.

Хтосьці палічыць, што жыццё сталічнага пенсіянера даволі прывілеяванае. Старыя людзі з правінцыі не мараць і пра такое. Але гэты эпітэт можна ўжыць хіба што з іроніяй, бо неабходнасць нешта вышукваць патанней, ашчаджаць кожны рубель, выбіраць паміж кефірам і смятанай, шукаць другасортную калбасу непазбежна паўплывае на пачуццё ўласнай годнасці.

ГОСЦЬ РЭДАКЦЫІ

**Станіслаў Гусак нарадзіўся на Данеччыне (Украіна) у шахцёрскім мястэчку. У 1966 годзе прыехаў у Беларусь, паступіў у БПІ на энергетычны факультэт (спецыяльнасць "Цеплавыя і электрычныя станцыі"). Больш за 30 гадоў займае адказныя пасады на прадпрыемствах паліўна-энергетычнага комплексу нашай краіны. Жыхар Серабранкі з 1980 года.**



Артур Лагодны

# АЭС можа быць, але... толькі французская

Сяргей Мудрачэнка

Размова са спадаром Станіславам пачалася на беразе канала, куды мы выйшлі на шпацыр разам з сабачкам гаспадара. Едучы ў ліфце, не маглі не звярнуць увагі на спецыфічную лужыну, што змусіла сп. Гусака зрабіць выправу ў мінуўшчыну. "Калі я стажаваўся ў англійскім Лідсе, пачуў цікавую гісторыю. Гэты буйны прамысловы цэнтр падчас Другой сусветнай вайны зазнаў значныя разбурэнні. Каб хутчэй збудаваць жытло для месцічаў, улады ўзялі за прыклад шматпавярховікі савецкага тыпу. У тыя гмахі сяліліся вялізнымі сем'ямі, усе між сабой знаёмыя – сваякі, прыяцелі, суседзі. З цягам часу людзі перабіраліся ў больш выгоднае жыллё, і ў дамох з'яўляліся новыя насельнікі, паміж якімі ўжо не было такіх шчыльных сувязяў. Адразу ж паўсталі праблемы – расквітнелі алкагалізм, наркаманія, прастытуцыя, бандытызм. Мясцовыя ўлады спрабавалі даць рады праз будаўніцтва дыскаклубаў, кавярняў, стадыёнаў і г. д. Узнікалі ўсё новыя забаўляльныя ўстановы, а вось адмоўныя з'явы заставаліся. І тады наважыліся на сапраўды радыкальны крок – увесь квартал шматпавярховай забудовы быў зруйнаваны, а жыхары былі перасеrange ў двухпавярховыя дамы. І гэта дало плён.

"А то іду, бачу, суседскі хлапчук сцізорыкам лупіць кару з клёна. На маю заўвагу адрэагаваў… ягоны бацька, маўляў, не замінай нашчадку вывучаць уласцівасці новай цацкі. А каб гэны абэлтух жыў у прыватным доме ды выйшаў папрактыкавацца з ножычкам ва ўласны сад клапатлівага татачкі?" – дзеліцца назіраннямі Станіслаў Гусак.

## БЧНК – шлях да энергетычнай бяспекі

Неабыякавасць нашага суразмоўцы да навакольнага жыцця і працэсаў, што адбываюцца ў грамадстве, прывялі яго ў 1989 годзе ў Беларускі народны фронт. Партыі былі патрэбныя прафесійныя здольнасці і асабовыя якасці сп. Станіслава. Наш суразмоўца стаў ініцыятарам і адным з распрацоўшчыкаў ідэі Балтыйска-чарнаморскага нафтавага калектара (БЧНК), рэалізацыя якой дазваляе энергетычна злучыць краіны ад Чорнага да Балтыйскага мораў, даючы магчымасць Беларусі, а таксама Украіне, Літве атрымліваць нафту не толькі з Усходу (то бок Расіі), але і з Поўдня ды Поўначы.

> *"АЭС можна будаваць у Беларусі, але не расійскую, каб не трапіць у яшчэ большую залежнасць ад усходняй суседкі"*

Спалучаючы ў сабе як эканамічны, так і палітычны эфект, БЧНК быў вельмі надзённы для нашай краіны як у 90-я гады, так і цяпер. У 1992 годзе ў Мінску адбылася Першая міжнародная канферэнцыя, прысвечаная гэтай тэме. Была дасягнутая папярэдняя дамоўленасць з Еўрапейскім банкам рэканструкцыі развіцця аб фінансаванні праектных і нават мантажных работ.

## У чаканні свайго часу

Цікавасць да калектара не знікла і пасля прэзідэнцкіх выбараў 1994 года: распрацоўшчыка БЧНК прыняў і дзве гадзіны з ім гутарыў тагачасны першы намеснік старшыні беларускага ўрада Міхаіл Мясніковіч. "Беларусь нават дала заяўку ўкраінскаму інстытуту транспарту нафты, які падрыхтаваў праект з 11 варыянтамі пракладкі нафтаправода. Ён ляжыць у Лукашэнкі ў схованцы", – сцвярджае наш суразмоўца.

## Палітыка перамагла здаровы сэнс

Але потым новыя ўлады распачалі інтэграцыйныя гульні з усходняй суседкай. Выявілася, што энерганосьбіты можна атрымоўваць наўзамен за братнія абдымкі. Такім чынам палітычны складнік часова перамог эканамічныя аргументы пры вырашэнні стратэгічных пытанняў энергазабеспячэння. А крыху пазней наогул стала не да юру – вынесці б скуру.

## Спецслужбы не жартуюць

"Падчас падзей «Менскай вясны-96» быў заарыштаваны мой

калега з ЦЭЦ, які меў аднолькавае са мной прозвішча ды ініцыялы. Відавочна, КГБ палявала на мяне як на тагачаснага намесніка старшыні БНФ, але спецслужбы тут спракудзіліся. Прабавіўшы ў няволі 5 дзён, той небарака выйшаў на працу і раптам памёр. Сакратар Народнага руху Украіны М. Байчышын знік разам з дакументамі, якія я перадаў яму для Другой канферэнцыі на тэму БЧНК. 5 чалавек у масках уварваліся ў сядзібу НРУ і захапілі яго разам з падрыхтаванымі матэрыяламі. Пакуль паперы былі ў мяне, за мной штодня сачылі. Я тады меў напружаны расклад дня: асноўная праца з 730 да 17, у сядзібе БНФ знаходзіўся ад 18 да 2230. Два віжы штодня суправаджалі ад Управы да дома на працягу 3 -- 4 месяцаў. Я выйду на балкон, зірну долу – стаяць удвох, паляць ды плююць, адале сыходзяць. Як толькі я перадаў дакументы ў Кіеў, шпегі зніклі. …Калі быў на канферэнцыі ў Вільні, спыталі, дзе ахоўнік. На мой здзіўлены погляд адказалі: “Як ты бярэшся за тэму, за якой дзесяткі мільярдаў?”. Тлумачу, маўляў, я ж у братняй Летуве. “Ты мяркуеш, што тутака табе ўсе радыя? Вось ты прывёз сюды нафту – выпрацоўка энергіі на Ігналінскай АЭС зменшылася; гэта значыць, расейская мафія, што экспартуе сюды ядзернае паліва, страціла частку прыбыткаў. Ты думаеш, табе гэта нехта даруе?” Я, кажу, пра гэта не думаў…” – успамінае сп. Гусак.

## Калектар практычна створаны

А вось суседнія з Беларуссю краіны падышлі да праблемы энергетычнай бяспекі больш грунтоўна, паспеўшы шмат што зрабіць практычна. Так, украінцы ўжо збудавалі трубапровод Адэса – Броды, палякі неўзабаве пракладуць нітку ад Бродаў да Гданьска, і калектар ад Чорнага да Балтыйскага мора будзе створаны. Наша краіна можа лёгка да яго прылучыцца. Застанецца даць загад ад пераводзе “трубы” ў рэверсны рэжым (на думку сп. Станіслава, для гэтага дастаткова будзе палітычнай волі і каля двух тыдняў), і Беларусь можа чэрпаць нафту з іншых крыніц: казахскіх, азербайджанскіх, нават арабскіх.

ГОСЦЬ РЭДАКЦЫІ

## Плата за волю альбо страхоўка ад “энергетычных войнаў”

На пытанне карэспандэнта ВС, як патлумачыць людзям, калі гэтая нафта будзе даражэйшая за расейскую, прагучаў адказ з адценнем філасафічнасці: “Гэта плата за волю”. Што праўда, нават паспаліты люд у часе так званых “газавых” войнаў з РФ пераканаўся, што такая высокая залежнасць ад аднаго партнёра (на Расію, па словах эксперта, прыпадае 95% паставак энерганосьбітаў) вельмі небяспечная.

З гэтага пункта гледжання наш суразмоўца вітае і супольныя праекты з Венесуэлай ды Іранам: “Дадуць гэныя краіны па 2–3 млн, і ўжо добра. З Паўднёвай Амэрыкі не абавязкова везці, можна прадаць на бліжэйшых рынках (напрыклад, ЗША), а на ўтаргаваныя грошы набыць патрэбную колькасць з бліжэйшых крыніц”.

## АЭС made in France

Станіслаў Гусак з’яўляецца прыхільнікам развіцця ядзернай энергетыкі ў Беларусі. “Чым цеплавая станцыя розніцца ад АЭС? Турбіны, генератары, трубаправоды, засаўкі – усё аднакае, толькі іншы кацёл, у якім замест вугалю паляць уран. Але рэактар павінен быць нерасійскі, каб не трапіць у яшчэ большую залежнасць ад усходняй суседкі.

Пасля чарнобыльскай аварыі прапаганда супраць АЭС праводзілася і Расіяй, у выніку Еўропа села на ўсходнюю нафтагазавую іголку. “Газпром” тут праводзіў хітрую палітыку, “шродэрызм” разгарнуўся – і Крэмль атрымаў магчымасць праз эканоміку ўплываць на палітычныя падзеі”.

Дарагоўля і працягласць будоўлі сп. Гусака не бянтэжаць. “Можна было б прапанаваць французам збудаваць АЭС, каб яны былі ўласнікамі і прадаўцамі прадукаванае энергіі, якую беларусы маглі б купляць. У Францыі электраэнергія надта танная, а немцы не хочуць набываць, бо тады збанкрутуюць іхнія вугальныя шахты. За 15 год будаўніцтва Лукашэнка адыдзе ў нябыт, а Беларусь застанецца, і станцыя застанецца”.

## Будзем будаваць млыны?

Да альтэрнатыўных крыніц энергіі наш суразмоўца ставіцца досыць скептычна: ”Нават калі стварыць планаваны каскад ГЭС на Дняпры, то пры абмежаванасці нашых водных рэсурсаў мы здабудзем не болей за 2–3% ад патрэбы. За кошт шырокамаштабнай кампаніі ашчады (мадэрнізацыя абсталявання, замена лямпачак і г.д.) можна вымеркаваць яшчэ 10%.

Калі вас, паважаныя чытачы, зацікавілі тэмы, што былі закранутыя ў гутарцы са Станіславам Гусаком, то пішыце і тэлефануйце. Выказвайцеся, ці варта нам руйнаваць панельныя гмахі і будаваць атамныя станцыі, круціць свідравіны ў басейне ракі Арынока або рыхтаваць гарнякоў для месяцавых капальняў, каб здабываць напаўміфічны Гелій-3. Рэдакцыя будзе ўдзячная за ўсялякія меркаванні.

## P.S.

Ад моманту сустрэчы з нашым суразмоўцам да выдання наступнага нумару “ВС” прамінула болей за 3 месяцы, што змясцілі ў сабе шэраг падзей, якія мелі дачыненне да закранутай намі праблематыкі. Так, урад Беларусі накіраваў тром асноўным сусветным вытворцам атамных рэактараў лісты з запытам аб іхнім магчымым удзеле ў будаўніцтве беларускай АЭС; расійская кампанія хуценька адказала згодай, а вось заходнія канцэрны (французскі ды японска-амэрыканскі) паведамілі аб неабходнасці грунтоўных разлікаў.. У той жа час быў прызначаны галоўны інжынер будучай станцыі – грамадзянін Расійскай Федэрацыі. Спадар Станіслаў уважае гэта за кепскі знак, мяркуючы, што тутэйшыя ўлады ўжо прынялі пастанову на карысць нашай усходняй суседкі, а ўсе размовы аб магчымых будучых тэндэрах – проста прыклёп. Зрэшты, пажывем – пабачым, бо сітуацыя мяняецца імкліва. Відавочна, што Лукашэнка будзе марудзіць з канчатковым выбарам, зважаючы перадусім на палітычныя чыннікі.

ЗДАРОЎЕ

# Як чыноўнікі “вылечылі” інваліда

Дэмакратычны актывіст Серабранкі, арганізатар незалежнага назірання на прэзідэнцкіх выбарах 2006 года Юры Лемеш, які пакутуе на цяжкую хваробу суставаў і скуры, дайшоў да суда, патрабуючы аднавіць 3-ю групу інваліднасці. Прапануем Вам гісторыю спадара Юрыя.


АРТУР ЛАГОДНЫ

Юры Лемеш дабіваецца перагляду рашэння МРЭК ад 2006 года і вяртання 3 групы інваліднасці. Накіроўваць на абследаванне зараз яго не хочуць па фармальных прычынах: ён не браў у 2007 годзе бальнічны.

### Паходы па пакутах

31 сакавіка 2006 года па рашэнні раённай МРЭК, нягледзячы на пагаршэнне стану майго здароўя, мне без тлумачэння прычынаў адмянілі 3-ю групу інваліднасці. Старшыня МРЭК, нягледзячы на сумневы іншых чальцоў камісіі, была непахісна ў сваім рашэнні. Гэта было вельмі падобна на помсту раённых чыноўнікаў за маю прынцыповую пазіцыю назіральніка тэрытарыяльнай камісіі на выбарах. На развітанне мне сказалі: “Калі не згодныя, вунь там у калідоры ёсць узор заявы. Скардзіцеся. Усё, да пабачэння”.

Я звярнуўся ў цэнтральны МРЭК № 2, каб яны перагледзелі рашэнне ніжэйшай камісіі, але безвынікова. Чыноўнікі паведамілі, што ў мяне палепшыўся стан крыві, таму маўляў і здымаецца інваліднасць. Але ж у мяне невылечная хвароба суставаў! Аналіз крыві можа сведчыць пра запаленчыя працэсы. Яны могуць то ўзмацняцца, то сціхаць пад уздзеяннем тэрапіі, нават надвор’я, але паталагічныя змены ў суставах пры гэтым не знікаюць.

Я звярнуўся да старшыні Камітэту па ахове здароўя пры Мінгарвыканкаме (КАЗ) з заявай, дзе прасіў патлумачыць падставы для зняцця групы інваліднасці. Мне адказалі: “Вы абследаваны, і вам па выніках абследавання група знятая”. Я папрасіў Камітэт абавязаць МРЭК № 2 даць мне пісьмовы адказ пра прычыны зняцця інваліднасці з указаннем усіх маіх дыягназаў.

### Хваробу не заўважылі?

Справа ў тым, што ў мяне псарыятычны поліартрыт (альбо артрапатычны псарыяз) з пашкоджаннем верхніх і ніжніх канечнасцяў, што з’яўляецца безумоўнай падставай для надання 3 ці 2 групы інваліднасці. У пісьмовым адказе Камітэта па ахове здароўя гэты сур’ёзны дыягназ дзіўным чынам знік. Чыноўнікі ад медыцыны ў мяне “знайшлі” поліартрыт, хранічную язву, мочакаменную хваробу, піеланефрыт, остэахандроз, варыкозную хваробу ног. Але заявілі, што падстаў для надання групы інваліднасці няма.

Мне прыйшлося скардзіцца на Камітэт у Мінздраў. Адказ на свой ліст, дасланы ў канцы 2006 года я так і не атрымаў. Але Міністэрства накіравала мяне на абследаванне ў Аксакаўшчыну. Прычым канчатковы дыягназ мне вынес не дэрматолаг, не рэўматолаг, а хірург. Не дзіва, што ён не заўважыў артрапатычнага псарыязу.

### Іншы пункт погляду

Але ж я прайшоў абследаванне ў сваёй паліклініцы № 17 (па месцу жыхарства) і Мінскім дыягнастычна-кансультацыйным цэнтры на Сямашка. Дык вось, там мне дыягнаставалі поліартрыт 2-й ступені (больш цяжкай). Трохі пазней гэты дыягназ пацвердзіла доктар медычных навук НДІ Траўматалогіі і артапедыі спадарыня Бараш. У бальніцы мне нават прадпісалі хадзіць з мыліцамі.

Такім чынам, калі адны медыкі на адным абследаванні (па распараджэнні Міністэрства аховы здароўя) знаходзяць толькі прыкметы поліартрыта, іншыя (пры незалежнай дыягностыцы) бачаць ужо хваробу 2-й ступені!

На папярэднім слуханні чыноўнікі Камітэта аховы здароўя мяне нават папракалі, што я звяртаўся не ў сваю паліклініку па месцы прапіскі, а па месцу жыхарства. Але ўсё было на законных падставах.

КАМЕНТАР СЕРАБРАНСКАГА ЭКСПЕРТА

**Сапраўды, пры псарыязе вельмі часта пашкоджваюцца суставы. З цягам часу такія пашкоджанні прыводзяць да распаду сустаўных паверхнасцяў, а ў далейшым - да развіцця падвывіхаў і анкілозаў, што абмяжоўвае рухомасць суставаў і выклікае моцны боль.**

**Вялікае значэнне пры дыягностыцы функцыянальных парушэнняў мае іх рэнтгеналагічнае абследаванне. Калі ў спадара Лемеша пры незалежным медычным абследаванні рэнтгеналагічна выяўляюцца артрапатычныя змяненні ў суставах, ёсць усе падставы для разгляду пытання аб яго інваліднасці. Адмова разгляду гэтага пытання ў такім разе сведчыць аб прадузятым да яго подыходзе.**

ЗДАРОЎЕ

## Суд не рассудзіў

Урэшце я падаў на Камітэт аховы здароўя ў суд Ленінскага раёна Мінска. Я хацеў, каб суд прымусіў Камітэт вярнуць страчаны дыягназ (псарыятычны поліартрыт) і аднавіць мне 3-ю групу інваліднасці.

Падазраю, што спецыялісты Камітэта па ахове здароўя сфальшавалі дыягназ і панізілі ступень цяжкасці захворвання. Я лічу, што дактары, якія мяне аглядалі па накіраванню Камітэта, адмыслова давалі больш мяккі дыягназ, каб прыкрыць памылкі сваіх калег.

На паперы "знік" поліартрыт, і мне цяпер не выпісваюць адпаведныя лекі. Пасля зняцця групы інваліднасці я страціў магчымасць сацыяльнай рэабілітацыі.

Я цяпер фактычна пазбаўлены права на своечасовую тэрапію сваіх хвароб, бо, паколькі я не маю групы інваліднасці, мне прапануюць пачакаць чаргі на медычную рэабілітацыю 2-3 месяцы. Калі дапякае невыносны боль, я вымушаны звяртацца па платныя паслугі.

На падставе рэкамендацый фізіёлага працы Аксакаўшчыны з мяне знялі дапамогу па беспрацоўю. Мне сказалі: "Вы можаце нават грузчыкам працаваць". Тым часам пры абвастрэнні я не магу ўтрымаць кубак з гарбатай, не магу стоячы ехаць у грамадскім транспарце, самастойна прыняць ванную.

На судзе чыноўнікі Камітэта Мінгарвыканкама прызналі, што "забыліся" узгадаць поліартрыт пры ліставанні са мной, але правамоцнасць вынікаў альтэрнатыўных абследаванняў не прызналі.

**Запісаў Артур Лагодны**

У СУДОВАЙ ЗАЛІ

# "Калі ў цябе няма пачака бальнічных, ты здаровы нават калі паміраеш..."

Па словах чыноўніц, якія абаранялі пазіцыю Камітэта аховы здароўя у судзе Ленінскага раёна Мінска, людзі імкнуцца атрымаць інваліднасць з-за шэрагу льготаў. Інвалід 3 групы можа адначасова атрымліваць заробак і пенсію, мае льготы па падатках, што істотна для прадпрымальніцкай дзейнасці. Яны сцвярджалі, што хоць пацыент меў хваробы суставаў, абмежаванняў у руху ў яго ў 2006 годзе не было.

На слуханнях у судзе прадстаўніца МРЭК, жыхарка Серабранкі Ганна Шышко адзначыла, што не ўсе дыягназы ўплываюць на рашэнне пра наданне ступені інваліднасці. "У пацыэнта можа быць 20-30 захворванняў, але інваліднасць надаецца па выніках хвароб, ступені функцыянальных парушэнняў", – заўважыла спадарыня Шышко.

"У нас такая сістэма, каб атрымаць групу інваліднасці, трэба хварэць, мець пачак бальнічных. Калі не ходзіш па дактарах, ты здаровы, нават калі паміраеш", – сумна падсумоўвае спадар Лемеш.

Па суб'ектыўных адчуваннях здароўе Юрыя Лемеша істотна пагоршылася за апошнія 2 гады. Пашырыўся поліартрыт (дадалося 2 галенастопных сустава), пагоршыўся стан вен (трэба рабіць аперацыю, але нельга, бо псарыяз), з'явілася хвароба нырак ад ужывання лекаў, астэахандроз. Пры абследаванні медыкі ў прыватных гутарках казалі, што па сукупнасці хваробаў мусяць даць не тое што 3-ю, нават 2-ю групу інваліднасці.

Суддзя Ленінскага раёна Дзіна Кулеш пакінула скаргу Юр'я Лемеша на Камітэт аховы здароўя без задавальнення. Аналагічнае рашэнне праз некаторы час прыняў Мінскі гарадскі суд. На прыкладзе гэтай сумнай гісторыі даводзіцца канстатаваць, што праз нашу зафармалізаваную судовую сістэму вельмі няпроста абараніць інтарэсы звычайнага чалавека.

ДАВЕДКА

## У Беларусі паўмільёна інвалідаў

**У Беларусі на сёння шні дзень зарэгістравана 510 тысяч інвалідаў розных групаў. Пра гэта паведаміў міністр працы і сацыяльнай абароны Уладзімір Патупчык.**

**Па словах міністра, працаздольных інвалідаў 309 тысяч, аднак з із працуе толькі 92 тысячы.**

**Са сродкаў фонду сацабароны ў 2008 годзе планавалася вылучыць два с паловай мільярда рублёў на кампенсацыю наймальнікам, якія ствараюць працоўныя месцы для інвалідаў.**

**Паводле "Інтэрфакс"**

ВЕРСІІ

# Чаму Лемеш стаў "здаровым"?

**Версія № 1**

Актывіст Ленінскага раёна Юры Лемеш падчас выбараў 2006 года быў назіральнікам у раённай выбарчай камісіі. Спадар Юры актыўна дзяліўся інфармацыяй пра зафіксаваныя парушэнні падчас галасавання з незалежнымі назіральнікамі, чым выклікаў паніку ў сябраў раённай выбарчай камісіі. Праз месяц раённыя чыноўнікі ад медыцыны пазбавілі яго інваліднасці.

**Версія № 2**

Сп. Лемеш мяркуе таксама, што змяншэнне колькасці інвалідаў у краіне адбываецца ў рэчышчы агульнадзяржаўнай палітыкі. Толькі гэта адбываецца не за кошт аздараўлення нацыі, а за кошт неапраўдана жорсткіх патрабаванняў пры наданні інваліднасці (калі відавочна, што чалавек ледзь не канае).

Вядома, што ў 2006 годзе шмат у каго ў Беларусі знялі групу інваліднасці. Пра тое, што колькасць інвалідаў старэйшая за 18 гадоў знізілася, было заяўлена па тэлевізіі ў 2006 годзе адказным чыноўнікам Міністэрства. Ясна, што гэта адбылося не з-за раптоўнага цудадзейнага аздараўлення.

А ўлічваючы наступствы аварыі на ЧАЭС, памяншэнне інвалідаў выглядае асабліва дзіўна. Зразумела, што усе гэтыя поліартрыты з'яўляюцца з-за Чарнобыля, бо актыўны стронцый замяшчае ў касцях кальцый. Але на гэта накладзена табу. Мне дактары па сакрэту сказалі, што ім даведзена, каб хваробы, выкліканыя радыяцыяй, ні ў якім разе не звязвалі з выпраменьваннем.

ПАМЯЦЬ

# Дзяды ў Лошыцкім Яры*



Акцыя памяці ахвяраў сталінскага тэрору прайшла ў Лошыцы на ўскрайку Мінску.

Дазволеная ўладамі акцыя з нагоды Дня памінаньня продкаў (Дзяды) пачалася 9 лістапада а 12-й гадзіне з шэсьця ад Палаца культуры "Лошыцкі". Ейныя ўдзельнікі зь кветкамі, нацыянальнымі сьцягамі і сымбалямі ды расьцяжкамі "Дзяды", "Абаронім Беларусь ад расейскага імпэрыялізму" прайшлі да Лошыцкага Яру, дзе і правялі мітынг.

У акцыі памяці ахвяраў сталінш-чыны, заарганізаванай КХП-БНФ, узялі ўдзел прыкладна 50 чалавек.

> *"У Магілеве на Дзяды мы таксама наведваем месцы, дзе камуністы масава зьнішчалі людзей. І там нас гэтак сама "ахоўвае" уся мясцовая гэбня з міліцыянтамі. З тою толькі розьніцаю, што магілеўскія ўлады ня толькі крыж у нас аднавілі, але і месца ўпарадкавалі, пліткаю выклалі, " – заўважыў адзін з удзельнікаў Лошыцкага шэсця.*

Шэсьці і мітынгі каля крыжа "Ахвярам бальшавіцкага тэрору" ладзяцца ад пачатку 1990-х, калі адкрылася праўда пра масавыя забойствы ля Лошыцкага парку, дзе рэжымам схаваныя былі тысячы бязьвінна закатаваных. Мітынг распачаты быў гімнам "Магутны Божа" і вітальным словам Зянона Пазьняка, якое зачытаў адзін зь лідэраў партыі Валер Буйвал.

"Працягваюцца нашыя Дзяды. Сёньня мы ў Лошыцы, на месцы былога яру, дзе ў 1937 годзе расейскія НКВДыстыя расстрэльвалі людзей. Так склалася наша цяжкая гісторыя, што перадусім мы мусім захаваць памяць пра генацыд беларускага народу. Гэта вельмі важна для нашага разьвіцьця і нацыянальнага адраджэньня", – гаварылася ў пасланні.

Зянон Пазьняк выказаў спачуванне расейскім грамадзянам, якія "аказаліся заложнікамі гэбісцкае хунты". Легендарны лідэр Народнага Фронту лічыць, што "Дзяды заклікаюць нас да пільнасьці, а калі трэба, то і да барацьбы".

Удзел у акцыі памяці ў Лошыцы ўзялі такія вядомыя людзі, як палітык Вячаслаў Сіўчык, прадпрымальнік Аляксандар Макаеў. На гадзіну раней у Лошыцкім яру ўсклала кветкі й запаліла зьнічы прадстаўніцтва Партыі БНФ на чале з намеснікам старшыні партыі Віктарам Івашкевічам.

**Юрась Навіцкі (фота аўтара)**



ДАВЕДКА "ВС"

**Месца масавых забойстваў у Лошыцы было адкрытае ў 1988 годзе. Як лічаць навукоўцы, расстрэлы ў Лошыцкім Яры адбываліся ў 1937 годзе. Па некаторых ацэнках, тут знаходзяцца парэшткі 7-10 тыс. чалавек. Сеньня побач з Крыжом – помнікам ахвярам камуністычнага тэрору, на месцы Лошыцкага Яру стаяць гаражы.**

СМІ

# "НН" і "НВ" вяртаюцца

Рады паведаміць Вам, шаноўныя чытачы "ВС", што ў шапікі "Белсаюздруку" і ў падпіску праз "Белпошту" вяртаюцца "Наша Ніва" і "Народная Воля".

"Наша Ніва – гэта незалежная газета, якая піша пра ўсе праявы жыцця беларусаў і мэтай сваёй ставіць захаванне беларускай тоеснасці і незалежнасці грамадства ад дзяржавы. Мы пішам праўду, якую не паказваюць па тэлевізары і не друкуюць у дзяржаўных і прыкормленых газетах – хто ёсць хто ва ўладзе і апазіцыі, які рэальны стан нашай эканомікі. У нас шмат публікацыяў пра незалежную беларускую культуру. Мы друкуем каментары і аналітычныя артыкулы найлепшых незалежных палітолагаў, эканамістаў, пісьменнікаў", – кажа жыхар Серабранкі, рэдактар "НН" Андрэй Скурко.

Падпісны індэкс "НН" для індывідуальных падпісчыкаў 63125, для ведамаснай – 631252. Нагадаем, газета выходзіць на тарашкевіцы.

АКЦЫІ

# Прадпрымальнікі выйдуць на марш

Заяўка на 15 снежня ўжо пададзена ў Мінгарвыканкам

Індывідуальныя прадпрымальнікі рынку "Свелта" маюць намер выйсці пратэставаць супраць увядзення новага парадку сплаты ПДВ на мяжы, бо ніякіх магчымасцяў для дакументальнага суправаджэння дробных партыяў тавару няма. ІП на маршы пратэсту, які **15 снежня** пачнецца ад Акадэміі Навук і завяршыцца мітынгам на пл. Бангалор, будуць таксама патрабаваць прыняцця Закону пра прадпрымальніцтва, які будзе абараняць правы дробных бізнесоўцаў.

Некаторыя ІП таксама збіраюцца страйкаваць **11 снежня**.

Мясцовае недзяржаўнае грамадска-палітычнае выданне
**"Вольная Серабранка"**
Выдавец і заснавальнік – супольнасць дэмакратычных актывістаў Ленінскага раёна г. Мінска.
Друкуецца пры падтрымцы ЦВІ г. Мінска.
За змест матэрыялаў адказваюць аўтары.

Галоўны рэдактар – Артур Лагодны.
**Пры выкарыстанні матэрыялаў і фотаздымкаў "ВС" спасылка абавязковая**!
Газета выдаецца на беларускай мове сучасным правапісам за выняткам матэрыялаў, пазначаных "*". Пазначаныя такім чынам матэрыялы захоўваюць правапіс аўтара.

Капіяванне газеты і распаўсюд сярод сваякоў і знаёмых вітаецца.
Інтэрнэт-старонка: http://serabranka.at.tut.by
Рэдакцыйны інтэрнэт-адрас: serabranka@tut.by
Лісты можна дасылаць на адрас: *Мінск, пр. Машэрава, 8 (Управа ПБНФ), для рэдактара "ВС"*

Рэдакцыйны тэлефон: (8-029)9625143
**РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА БЯСПЛАТНА**
Наклад 299 экз. (дадатковы 1). Замова № 101.
Падпісана ў друк у 0:10 1.12.2008 г.